# ИСТОРИЧЕСКИЕ НАУКИ

УДК 94 (476): 39: 008 “1991–2004”

## РАЗВІЦЦЁ АДУКАЦЫІ ЭТНІЧНЫХ СУПОЛЬНАСЦЯЎ БЕЛАРУСІ Ў 1991–2004 ГАДАХ

***Е.Н. ОБУХОВА***
*Гродненский государственный университет имени Янки Купалы,*
*г. Гродно, Республика Беларусь*

Для этнічных супольнасцяў, што пражываюць у іншамоўным асяроддзі, важнейшым з’яўляецца передача этнакультурнага вопыту наступным пакаленням, выхаванне дзяцей у адпаведнасці з уласнымі традыцыямі і звычаямі. Спецыяльна арганізаваны навучальны працэс дазваляе не толькі сфарміраваць у дзяцей цэласную этнічную самасвядомаць, але інтэграваць у склад этнічнай супольнасці, дапамагае ўстанавіць кантакты з замежнымі часткамі этнасу праз вывучэнне літаратурнай мовы, гісторыі свайго народа. Ва ўмовах культурнай уніфікацыі, калі малыя этнічныя супольнасці страчваюць у сваім побыце многія культурныя элементы, актуальным з’яўляецца далучэнне да этнакультурных каштоўнасцяў не толькі дзяцей, але моладзі і старэйшага пакалення.

Навуковае даследаванне развіцця адукацыі этнічных супольнасцяў Беларусі пачалося з другой паловы 1990–х гг., калі ўжо быў напрацаваны пэўны досвед дзейнасці ў гэтай сферы. Гэтай тэме былі прысвечаны артыкулы В.Ф. Касовіч, В.І. Мацюшэнкі, В.П. Паўлоўскай, С.А. Яцкевіча [1; 2; 3; 4]. Развіццё адукацыі польскай і іншых этнічных супольнасцяў на Гродзеншчыне ў 90–х гг. ХХ – пачатку ХХІ стст. разглядалася ў артыкулах М.Я. Калацэй і Н.Л. Улейчык [5; 6; 7; 8; 9; 10]. Аднак у айчыннай гістарыяграфіі не было праведзена комплекснага даследавання развіцця адукацыі этнічных супольнасцяў у масштабе рэспублікі ў постсавецкі час. Мэта дадзенага артыкула – раскрыць асаблівасці станаўлення адукацыі этнічных супольнасцяў у Беларусі ў 1991 – 2004 гг. Такі храналагічны адрэзак выбраны ў адпаведнасці з логікай развіцця сацыякультурнай сферы Беларусі: ніжняя мяжа адпавядае стварэнню незалежнай Рэспублікі Беларусь, у выніку чаго змяніліся ўмовы ажыццяўлення культурна–асветніцкай дзейнасці, верхняя – прыняццю новых рэдакцый законаў «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь» (ад 5.01.2004 № 261–З) і «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» (ад 18.05.2004 № 282–З), у якіх была заканадаўча замацавана мадэль культурнага развіцця этнічных супольнасцяў, што склалася за папярэдні перыяд.

**Польская этнакультурная адукацыя**. Сярод этнічных супольнасцяў першымі адраджэннем адукацыі занялiся палякі яшчэ ў канцы 1980–х гг., калі ў асобных школах Гродзенскага раёна пачаліся факультатыўныя заняткі па польскай мове [11, s. 6; 5, c. 256]. Набыццё дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікай Беларусь значна актывізавала працэсы нацыянальна–культурнага адраджэння польскай этнічнай супольнасці. У 1991/1992 навучальным годзе ўжо больш за 10 тыс. навучэнцаў вывучалі польскую мову як прадмет ці факультатыў, у гуртках і курсах па выбары ў 280 школах Брэсцкай, Гродзенскай, Віцебскай і Мінскай абласцей, а таксама горада Мінска [12, арк.34]. Большая частка навучэнцаў пражывала ў Гродзенскай вобласці, дзе ў 30 школах 1360 дзяцей вывучалі польскую мову як прадмет, 5666 вучняў у 134 школах займаліся яе вывучэннем на факультатыўных занятках [13, арк.1 адв.]. У 1993/1994 навучальным годзе польскую мову вывучалі ўжо 14,3 тыс. вучняў у 310 школах Беларусі (з іх 73 % – у Гродзенскай вобласці) [4, c.16]. У перыяд з 1994 па 2000 гг. колькасць навучэнцаў, што вывучалі польскую мову ў форме прадмета і факультатыва ў дзяржаўных агульнаадукацыйных школах, стабільна перавышала 9000, з 2000 г. намецілася агульная тэндэнцыя да яе зніжэння, і ў 2005 г. яна склала 7394 вучня [14, c.50, табліца].

Польская грамадскасць імкнулася да арганізацыі паўнавартаснага вучэбна–выхаваўчага працэса на польскай мове ў сярэдніх школах. У 1991 г. у сярэдніх школах № 3 і 23 горада Гродна адкрыліся першыя польскамоўныя класы, дзе навучалася 49 першакласнікаў [7, c.305]. У 1993 г. з’явіліся польскія класы ў сярэдніх школах Гродна (№ 17 і 25), Ваўкавыска (№ 2), Мінска (№ 1), Брэста (№ 9), а таксама ў Навагрудку, Лідзе, Сапоцкіне, вёсках Больцішкі і Пашковічы Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці [2, c.28; 15]. У 1995/1996 навучальным годзе ў Беларусі 517 вучняў навучаліся на польскай мове, з іх 421 навучэнец пражываў у Гродзенскай вобласці [16, арк.375]. У другой палове 1990–х гг. колькасць вучняў, якія навучаліся на польскай мове, рэзка

Полесгу

ўзрасла пасля адкрыцця дзяржаўных сярэдніх школ з польскай мовай навучання ў 1996 г. у Гродне і ў 1999 г. у Ваўкавыску. Выпускнікі школ і класаў з польскай мовай навучання арыентаваліся, у першую чаргу, на працяг навучання ў Польшчы [8, с.61; 10, с.334]. У 2000/2001 навучальным годзе колькасць вучняў, якія навучаліся на польскай мове, дасягнула 903 чалавекі, аднак у 2004 г. адбылося зніжэнне да 656 чалавек (узровень 1996/1997 навучальнага года). Тыя ж тэндэнцыі былі характэрны для дынамікі колькасці вучняў у саміх польскіх школах з той толькі розніцай, што ў іх максімальная колькасць вучняў назіралася ў 2001/2002 навучальным годзе [17, с.51, 53, табліца; 18, с.37, 38, табліца; 19, с.22, 23, табліца; 20, с.21, табліца 3.10; 21, с.51, табліца]. Скарачэнне колькасці навучэнцаў было абумоўлена як наступствамі дэмаграфічнага крызісу, які пачаўся ў Беларусі ў 1993 г., так і складанасцямі з працаўладкаваннем пасля заканчэння польскіх навучальных устаноў [19, с.140].

Першаснае знаёмства з польскай мовай і культурай адбывалася ў дзяржаўных дзіцячых дашкольных установах. У 1994/1995 навучальным годзе ў дзіцячых садках Гродзенскай вобласці дзейнічала ўжо 19 гурткоў, дзе вывучалі польскую мову 262 дзіцяці [2, с.28]. У далейшым гэты паказчык вырас: у 2004/2005 навучальным годзе ў 39 дзіцячых садах Гродзеншчыны ў 61 гуртку польскай мовы займаліся 778 дзяцей [22]. Падобныя гурткі ў дзіцячых садках былі таксама арганізаваны ў Брэсцкай і Віцебскай абласцях, аднак у іх займалася значна меншая колькасць дзяцей [2, с.28].

Для польскай мовы шырока распаўсюджанай формай навучання былі гурткі, якія дзейнічалі як пры школах, так і пры пазашкольных установах. У 1997/1998 навучальным годзе ў гуртках і на факультатывах вывучала польскую мову 11028 дзяцей [23, s.267]. Па дадзеных грамадскага аб'яднання «Польска мацеж школьна», польскую мову на пазакласных занятках у 2002/2003 навучальным годзе вывучала 15937 асоб, у 2004/2005 навучальным годзе – 6424 чалавека [24].

Польскія грамадскія аб'яднанні актыўна арганізоўвалі грамадскія школы, якія дзейнічалі пераважна на базе іх офісаў і «Дамоў польскіх» [25]. Польскія грамадскія школы былі досыць шматлікія. Напрыклад, у грамадскай суботне–нядзельнай школе пры «Клубе польскім» у Баранавічах у 1993 г. вучылася 380 дзяцей [26], у 1995 г. – 240 вучняў [27]. У 2004 г. у грамадскай польскай школе ім. Л. Нарбута горада Ліды займалася 190 чалавек, у Брэсце пры «Клубе польскім» кожны год вучылася каля 400 чалавек [28]. Па дадзеных грамадскага аб'яднання «Польска мацеж школьна», колькасць дзяцей у грамадскіх школах у 2000–х гг. паступова змяншалася: у 2003/2004 навучальным годзе яна складала 2669 чалавек, у 2004/2005 навучальным годзе – 1050 чалавек [24].

Падлічыць агульную колькасць навучэнцаў, ахопленых рознымі формамі польскай этнакультурнай адукацыі, досыць складана, паколькі не вялося дакладнай статыстыкі па пазашкольных формах навучання. У 1997/1998 навучальным годзе 19353 дзяцей у 325 школах вывучалі польскую мову ў розных формах, з іх 12835 у Гродзенскай вобласці [23, s.267]. У пачатку 2000–х гг. па статыстыцы грамадскага аб'яднання «Саюза палякаў на Беларусі» польскую мову ў розных формах вывучала каля 20 тыс. вучняў, у 2004 г. гаварылася ўжо аб 21,5 тыс. асобах [29; 30, s.4].

Польскія грамадскія арганізацыі таксама займаліся асветай моладзі і дарослых. У Гродне грамадскім аб'яднаннем «Польска мацеж школьна» былі арганізаваны Грамадскі ліцэй (1995 г.) і Універсітэт Трэцяга ўзросту (1997 г.). У ліцэі рыхтавалі жадаючых для паступлення ў польскія ВНУ. На занятках вывучалі польскую мову і літаратуру, гісторыю і геаграфію Польшчы, прыродазнаўчыя і матэматычныя прадметы, выкладаўся курс польскай культуры, дзе слухачы вучыліся польскім народным песням і танцам, адзначалі традыцыйныя польскія святы [31]. Ва Універсітэце Трэцяга ўзросту ў 2001 г. было 130 слухачоў ва ўзросце ад 45 да 85 гадоў з ліку польскай грамадскасці Гродна, якія вывучалі польскую мову, гісторыю [32].

**Украінская этнакультурная адукацыя** пачала развівацца ў 1991/1992 навучальным годзе, калі па ініцыятыве міжраённага таварыства ўкраінскай мовы «Просвіта» (Асвета) у некалькіх школах Кобрына і Драгічына 312 дзяцей пачалі вывучаць украінскую мову [33]. У 1992 г. пры школах Кобрына і Кобрынскага раёна існавала 14 груп вучняў, арганізаваных «Просвітою», якія вывучалі ўкраінскую мову ў гуртках, у 1994 г. такіх груп засталося толькі шэсць [34]. У Брэсце ў сярэдзіне 1990–х гг. мова і гісторыя Украіны вывучаліся ў сярэдніх школах № 17 і 27 [35, с.30]. Па дадзеных Галоўнага інфармацыйна–аналітычнага цэнтра Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, вывучэнне ўкраінскай мовы ў школах Беларусі (як можна меркаваць, некалькіх гарадскіх школах Гомельскай вобласці і Брэста (да 1999 г.)) [36, с.42, табліца; 18, с.35, табліца]) у якасці прадмета ці факультатыва пачалося з 1996/1997 навучальнага года, колькасць вучняў вагалася ка-

ПолесГУ

ля лічбы 100 чалавек [14, с.50, табліца]. У Брэсце з 2002 г. заняткі па вывучэнні ўкраінскай мовы аднавіліся ў выглядзе факультатыва пры гарадскім ліцэі № 1 [35, с.30].

Няшмат звестак захавалася пра ўкраінскія нядзельныя школы. Вядома, што падобная школа працавала з 1998 г. пры мінскай сярэдняй школе № 80 [37]. У 2000 г. у Брэсце дзейнічала школа ўкраіназнаўства, дзе працавала 5 настаўнікаў. Дзеці з розных школ горада вывучалі ўкраінскую і англійскую мовы, вучыліся вышываць, быў арганізаваны хор. Школа мела філіял у сярэдняй школе № 25, дзе былі арганізаваны два вакальных калектывы, якія вывучалі фальклор Брэстчыны [38].

У пачатку 1990–х гг. у Беларусі адраджаецца **яўрэйская этнакультурная адукацыя**. Першыя класы, дзе дзеці вывучалі іўрыт, гісторыю яўрэйскага народа і геаграфію Ізраіля, пачалі працаваць на базе сярэдняй школы № 132 горада Мінска, у 1993 г. у іх навучалася 126 дзяцей, а ў 1994 г. ужо 150 [39, с.6; 40, с.158]. У Гомелі з 1994/1995 навучальнага года пачала працаваць пачатковая школа–сад «Аціква», дзе вывучаліся іўрыт, гісторыя і культура яўрэйскага народа [1, с.167]. З сярэдзіны 1990–х гг. у дзіцячых садках Гомеля («Аціква»), Віцебска (№ 50) і Мінска працавалі дашкольныя групы з вывучэннем іўрыта [1, с.167]. У пачатку 2000–х гг. падобныя групы адчыніліся ў Бабруйску, Пінску і Брэсце [41]. У 1994/1995 навучальным годзе 212 дзяцей вывучалі яўрэйскую мову ў дзяржаўных школах, у 2001/2002 навучальным годзе – ужо 441, далей колькасць вучняў зніжалася. У 2004 г. Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь адзначалася адсутнасць дзяцей, што вывучалі яўрэйскую мову ў Гомельскай вобласці [14, с.50, табліца].

Недзяржаўныя школы былі адкрыты яўрэйскімі арганізацыямі ў Бабруйску і Пінску. Іўрыт вывучаўся там як прадмет, як і ў класах, што дзейнічалі на базе дзяржаўных агульнаадукацыйных школ [41]. Агульнаадукацыйная яўрэйская школа–інтэрнат «Бейс–Агарон» у Пінску працуе з 2000 г. У першы год у яе паступілі 25 хлопчыкаў з розных гарадоў Беларусі. У наступным годзе быў аб'яўлены набор і хлопчыкаў, і дзяўчынак, якія займаліся паасобна. У школе вывучалі агульнаадукацыйныя прадметы, іўрыт і яўрэйскія традыцыі. Выпускнікі мелі магчымасць працягнуць сваю адукацыю за мяжой [42].

У 1993 г. у Беларусі працавала 13 яўрэйскіх нядзельных школ, дзе вучылася каля 1000 дзяцей. У далейшым іх колькасць узрастала: у 1995/1996 гг. у Беларусі працавала 16 падобных школ, у 1998 г. – 21, у 2003 г. – 19 [35, с.19; 43, с.15; 44]. У іх праграму ўваходзілі іўрыт, музыка і спевы, вывучэнне гісторыі яўрэйскага народа, традыцый іўдаізма [40, с.158].

Яўрэйскімі грамадскімі арганізацыямі надавалася значная ўвага адукацыі і асвеце дарослых. У лютым 1995 г. у Мінску быў створаны Яўрэйскі ўніверсітэт, у праграме якога былі такія прадметы, як іўрыт, англійская мова, «Гісторыя яўрэяў Беларусі», «Гісторыя яўрэйскіх арганізацый і ўстаноў Беларусі», «Гісторыя яўрэйскага мастацтва», «Найстаражытная гісторыя яўрэйскага народа» і інш. [43, с.15]. Ва ўніверсітэце працавалі 17 дактароў і кандыдатаў навук, выкладанне вялося на рускай мове, фінансаванне ажыццяўлялася за кошт Амерыканскага Яўрэйскага Аб'яднанага Размеркавальнага Камітэту «Джойнт», а заняткі праходзілі ў памяшканні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта [45, с.67]. У Мінску і Віцебску з сярэдзіны 1990–х гг. працаваў Адкрыты ўніверсітэт Ізраіля, які прадугледжваў завочнае навучанне [43, с.15].

З верасня 1999 г. у Беларускім дзяржаўным ўніверсітэце пачаў працаваць Міжнародны гуманітарны інстытут імя Марка Шагала, створаны на базе Яўрэйскага ўніверсітэта [46, с.100]. Дапамогу ў яго функцыянаванні аказваў Амерыканскі Яўрэйскі Аб'яднаны Размеркавальны Камітэт «Джойнт», найважнейшым партнёрам Інстытута выступаў Ерусалімскі яўрэйскі ўніверсітэт. У Інстытуце навучанне вялося па спецыяльнасцях «Замежныя мовы», «Дызайн», «Архітэктура», «Культуралогія» і «Маркетынг», былі адкрыты чатыры кафедры, у тым ліку іўдаікі [47]. Студэнты вывучалі гісторыю яўрэйскага народа і цывілізацыі, іўрыт, гісторыю яўрэйскай літаратуры і мастацтва. Аднак у верасні 2003 г. выйшаў загад Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь аб спыненні дзейнасці Міжнароднага гуманітарнага інстытута [48], і ў лютым 2004 г. гэтая ўстанова была зачынена [46, с.100]. Прычыны закрыцця інстытута агучаны не былі.

**Літоўская этнакультурная адукацыя.** З пачатку 1990–х гг. пачалося выкладанне літоўскай мовы ў трох дзяржаўных школах Воранаўскага і Астравецкага раёнаў Гродзенскай вобласці. У 1991/1992 навучальным годзе ў гэтых школах 101 чалавек вывучаў літоўскую мову [13; 3, с.37]. На працягу 1991–2004 гг. літоўская мова выкладалася ў школах, размешчаных у раёнах кампактнага пражывання літоўцаў: у Пеляскай і Больцішскай базавых школах Воранаўскага раёна, Гервяцкай, Гірскай, Рымдзюнскай сярэдніх школах Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці з беларускай мовай навучання [49; 50, арк.152]. Колькасць дзяцей, што вывучалі літоўскую мову ў форме прадмета і факультатыва, з 1994 па 2004 гг. не была пастаяннай, вагаючыся каля сярэдняга значэння 56 чалавек [14, с.50, табліца].

Полесгу

У 1992/1993 навучальным годзе ў вёсцы Пеляса Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці пачала сваю працу базавая (пазней – сярэдняя) недзяржаўная школа з літоўскай мовай навучання (ліцэнзія Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 23 ліпеня 1993 г., прадоўжана ў 1999 г.) [51, арк.54; 52, с.107]. Заснавальнікамі школы з'яўляліся Фонд культуры і Міністэрства асветы і навукі Літоўскай Рэспублікі. У першы год пасля адкрыцця ў школу хадзіла толькі 11 дзяцей, у 1995/1996 навучальным годзе там займалася 40 вучняў [53, с.100], у 1999 годзе – 60 вучняў [54]. У школе разам з мясцовай грамадскай арганізацыяй літоўцаў «Гімціне» адзначаліся нацыянальныя і дзяржаўныя святы Беларусі і Літвы. Утрыманне школы ажыццяўлялася за кошт Дэпартамента нацыянальных меншасцяў і эміграцыі літоўскага ўрада, у ёй працавалі настаўнікі з Літвы [54].

У вёсцы Рымдзюны Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці ў 1994 г. адкрыўся дзяржаўны дзіцячы садок з літоўскай мовай навучання, у тым жа годзе пачалося навучанне дзяцей на літоўскай мове ў мясцовай пачатковай школе [1, с.167; 49]. 10 кастрычніка 1996 г. на базе пачатковай адкрылася літоўская сярэдняя школа [55, с.19]. Колькасць вучняў, ахопленых літоўскамоўным навучаннем у Рымдзюнах, узрасла з 1994 па 1998 гг. амаль у пяць разоў (з 15 да 80 чалавек), але ў далейшым не перавышала 80 чалавек. Выпускнікі гэтай школы паступалі ў літоўскія навучальныя ўстановы [56].

Літоўскія нядзельныя школы пачалі адкрывацца пры літоўскіх грамадскіх аб'яднаннях з другой паловы 1990–х гг.: у 1995 г. такая школа з'явілася ў Мінску, у 1996 г. – у Гродне [49]. У 1999–2000 гг. у Беларусі дзейнічала не менш як шэсць літоўскіх нядзельных школ: у Гродне, Лідзе, Мінску, вёсках Палякі, Усоні, Вайнюнцы Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці. У 2004 г. іх колькасць дасягнула васьмі адзінак [57; 58, с.28–29].

**Адукацыя малых этнічных супольнасцяў**. Свае адукацыйныя ініцыятывы ў Беларусі ў 1991–2004 гг. развівалі не толькі прадстаўнікі чатырох вышэйназваных этнічных супольнасцяў. У 1990–х гг. грамадскія школы выхаднога дня былі створаны татарамі, армянамі, карэйцамі, латышамі, грузінамі, эстонцамі [59, с.22; 60; 17, с.258; 61, с.37]. Такая форма этнакультурнай адукацыі, як грамадскія школы была абрана імі з–за малалікасці прадстаўнікоў этнічнай групы і адсутнасці фінансавых сродкаў. Падобныя школы звычайна працавалі пры офісах грамадскіх аб'яднанняў этнічных супольнасцяў па выхадным дням і не давалі афіцыйных дакументаў аб сканчэнні курса. Выкладчыкамі выступалі ці дасланыя з краіны асноўнага пражывання этнасу настаўнікі, ці мясцовыя прадстаўнікі дыяспары, прайшоўшыя перападрыхтоўку за мяжой. Нядзельныя школы мінскіх грамадскіх аб'яднанняў некаторых этнічных супольнасцяў (армянскай, карэйскай, эстонскай) з 1995 г. дзейнічалі пры Рэспубліканскім цэнтры нацыянальных культур [59, с.22]. Невялікія этнічныя супольнасці мелі па адной нядзельнай школе, акрамя татар. Усяго вядома пра сем нядзельных татарскіх школ, якія дзейнічалі ў перыяд 1991–2004 гг. у Мінску, Навагрудку, Іўі, Гродне, Слоніме, Смілавічах і Маладзечне [62, с.48]. У 2000–я гг. адкрылася школа грэкаў у Маладзечна [63, с.9], школы азербайджан, афганцаў і немцаў у Мінску [64, арк.19; 65].

**Заключэнне**. Такім чынам, у 1991–2004 гг. у Беларусі 14 этнічных супольнасцяў развівалі ўласныя адукацыйныя ініцыятывы, якія вельмі адрозніваліся па колькасці ўдзельнікаў і формах арганізацыі.

Найбольш актыўна развівалася польская этнакультурная адукацыя. Больш за 90 % ад усіх вучняў, ахопленых выкладаннем этнакампанента ў той ці іншай форме, вывучалі польскую мову. Польская этнакультурная адукацыя характарызавалася шматстайнасцю формаў: ад дзяржаўных школ з польскай мовай навучання да нядзельных школ пры польскіх грамадскіх аб'яднаннях. Такое эфектыўнае развіцце польскай адукацыі было абумоўлена не толькі шматлікасцю прадстаўнікоў гэтай этнічнай групы, наяўнасцю месцаў кампактнага пражывання палякаў у Беларусі (найперш, у Гродзенскай вобласці), але і значнай дапамогай грамадскіх арганізацый і дзяржаўных устаноў краіны паходжання. Апошні фактар быў вырашальным і у развіцці літоўскай і яўрэйскай адукацыі, якія таксама вылучаліся разнастайнасцю формаў (прынамсі, імі былі адкрыты па дзве агульнаадукацыйныя школы, працавалі грамадскія школы, яўрэі актыўна займаліся адукацыяй дарослых), але ахоплівалі невялікую колькасць вучняў, што было звязана з невялікай колькасцю прадстаўнікоў гэтых этнічных супольнасцяў. Нягледзячы на значную колькасць украінцаў, што пражывалі ў Беларусі, украінская этнакультурная адукацыя развівалася досыць слаба, што было абумоўлена як нязначнай дапамогай краіны паходжання, так і досыць актыўным фукнцыянаваннем украінскай мовы ў сем'ях, адсутнасцю эміграцыі ў Украіну, меншай скіраванасцю моладзі на атрыманне там адукацыі.

Адукацыйныя ініцыятывы астатніх 10 этнічных супольнасцяў, такіх як азербайджанцы, армяне, афганцы, грузіны, грэкі, карэйцы, латышы, немцы, татары, эстонцы, існавалі выключна ў выглядзе

ПолесГУ

грамадскіх школ, у першую чаргу, з–за нязначнай колькасці этнафораў і дысперснасці іх рассялення па тэрыторыі Беларусі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Касовіч, В.Ф. Забеспячэнне адукацыйных патрэб нацыянальных меншасцей у Рэспубліцы Беларусь / В.Ф. Касовіч // Нацыянальная палітыка і міжнацыянальныя адносіны на Беларусі ў ХХ ст. : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун–т імя М. Танка, Фонд фундамент. даслед. Рэсп. Беларусь ; пад агул. рэд. А.М. Мацко, М.К. Сакалова. – Мінск, 1997. – С. 161–169.

2. Мацюшэнка, В. Моўныя праблемы адукацыі польскай меншасці ў заходнім рэгіёне Беларусі ў свеце міжнароднага вопыту / В. Мацюшэнка // Нацыянальная адукацыя: гісторыя, сучаснасць, перспектывы : тэмат. зб. матэрыялаў Міжнар. навук.–практ. канф., Брэст, 21–22 верас. 1995 г. / Брэсц. аб'яднанне рэгіян. арг–цыі «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына» ; навук. рэд. С.А. Яцкевіч. – Брэст, 1995. – Зб. 3. – С. 25–29.

2. Яцкевіч, С. Адукацыя этнічных меншасцей на Беларусі / С. Яцкевіч // Нацыянальная адукацыя: гісторыя, сучаснасць, перспектывы : тэмат. зб. матэрыялаў Міжнар. навук.–практ. канф., Брэст, 3–4 крас. 1995 г. / Брэсц. аб'яднанне рэгіян. арг–цыі «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына»» ; навук. рэд. С.А. Яцкевіч. – Брэст, 1995. – Зб. 1. – С. 35–37.

3. Яцкевіч, С. Нацыянальная адукацыя на беларуска–польска–літоўскім сумежжы ў ХХ ст. / С. Яцкевіч // Нацыянальная адукацыя : матэрыялы Міжнар. навук. канф., Брэст, 3–4 чэрв. 1997 г. / Рэсп. цэнтр нац. культур [і інш.] ; навук. рэд. С.А. Яцкевіч. – Брэст, 1997. – Кн. 8 : Нацыянальная адукацыя беларуска–польска–літоўскага сумежжа. – С. 11–19.

4. Колоцей, М.Я. Возрождение национального образования этнических меньшинств на Гродненщине в конце 80–х–90–е гг. ХХ в. / М.Я. Колоцей, Н.Л. Улейчик // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця заходняга рэгіёну Беларусі : матэрыялы Міжнар. навук.–практ. канф., Брэст, 23–24 крас. 1998 г. : у 2 ч. / Брэсц. дзярж. ун–т ; навук. рэд. С.В. Арцёменка [і інш.]. – Брэст, 1998. — Ч. 2. – С. 255–260.

5. Колоцей, М.Я. Государственная политика в области национального образования национальных меньшинств в 90–е гг. ХХ – начале ХХІ вв. / М.Я. Колоцей, Н.Л. Улейчик // Народы, культуры и социальные процессы на пограничье : материалы междунар. науч. конф., Гродно, 22–23 февр. 2010 г. / Гродн. гос. ун–т ; редкол.: Е.М. Бабосов [и др.]. – Гродно, 2010. – С. 426–431.

6. Колоцей, М.Я. Национальное образование национальных меньшинств на Гродненщине в конце 80–х–90–е гг. ХХ в. / М.Я. Колоцей, Н.Л. Улейчик // Этнасацыяльныя і культурныя працэсы ў заходнім рэгіёне Беларусі: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы рэсп. Навук. Канф., Гродна, 5–6 снеж. 1997 г. / Гродз. Дзярж. Ун–т ; пад рэд. І.П. Крэня – Гродна, 1998. – С. 303–308.

7. Колоцей, М.Я. Развитие национального образования этнических меньшинств на Гродненщине в 1990–е – начале 2000–х годов / М.Я. Колоцей, Н.Л. Улейчик // Весн. Гродз. Дзярж. Ун–та імя Янкі Купалы. Сер. 1, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. – 2010. – № 1. – С. 58–64.

8. Улейчик, Н.Л. Проблемы развития польского образования на Гродненщине в 90–е гг. ХХ в. / Н.Л. Улейчик // Чалавек. Культура. Педагогіка : матэрыялы рэсп. Нав. Канф., Мінск, 1–3 снежня 1998 г. / Беларус. Ін–т праблем культуры ; пад агул. Рэд. А.Я. Міхневіча. – Мінск, 1999. – С. 138–140.

9. Улейчик, Н.Л. Развитие польского образования на Гродненщине в 1990–е годы / Н.Л. Улейчик // Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы навук. Канф., Мінск, 6–7 снеж. 2001 г. / Ін–т гісторыі НАН Беларусі ; рэдкал.: У.І. Навіцкі (гал. Рэд.) [і інш.]. – Мінск : Дэполіс, 2001. – С. 331–335.

10. Znaczące daty w dziejach odrodzenia narodowego Polaków na Białorusi // Głos znad Niemna. – 1998. – 4 wrzes. – S. 6–7.

11. Обращения, письма учреждений, организаций и граждан о статусе польского языка и других вопросах культуры и сохранения историко–культурного наследия (19.02.1992–02.03.1992 г.). // НАРБ. – Фонд 968. – Воп. 12. – Д. 260. – Л. 34.

12. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Фонд 730. – Воп. 2. – Спр. 929. Зводныя статыстычныя справаздачы аб размеркаванні школ і навучэнцаў па мове навучання і вывучэнню роднай мовы на пачатак 1991/1992 навучальнага года па Гродзенскай вобласці.

13. Агульнаадукацыйныя школы Рэспублікі Беларусь па стану на 5 верасня 2004 г. : стат. Давед. / М–ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гал. Інфарм.–аналіт. Цэнтр. – Мінск, 2004. – 100 с.

14. Ejsmont, M. «Dopóki żyje język, żyje naród» / M. Ejsmont // Głos znad Niemna. – 2001. – 30 marca. – S. 1–2.

15. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Фонд 1171. – Воп. 7. – Спр. 16. Перапіска з Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Кабінетам Міністраў, прэм'ер–міністрам і іншымі па пытаннях узгаднення законаў, этнаканфесійнай сітуацыі ў горадзе Ліда.

16. Агульнаадукацыйныя школы па стану на 7 верасня 1995 г. : стат. Давед. / М–ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Выліч.–аналіт. Цэнтр. – Мінск, 1995. – 77 с.

17. Агульнаадукацыйныя школы Рэспублікі Беларусь па стану на 6 верасня 1999 г. : стат. Давед. / М–ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Выліч.–аналіт. Цэнтр. – Мінск, 1999. – 88 с.

ПОЛЕССУ

18. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. Фонд 1171. – Воп. 5. – Спр. 2965. Перапіска з Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь і яго камісіямі па пытаннях узгаднення законаў, работы СПБ, выканання дэпутатамі наказаў выбаршчыкаў.

19. Параўнальны аналіз развіцця адукацыі ў рэгіёнах Рэспублікі Беларусь : па стану на пачатак 2005/2006 навучальнага года : стат. давед. / М–ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гал. інфарм.–аналіт. цэнтр М–ва адукацыі Рэсп. Беларусь. – Мінск : ГІАЦ МА РБ, 2005. – 63 с.

20. Установы, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі па стану на 5 верасня 2006 г. : стат. давед. / М–ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Гал. інфарм.–аналіт. цэнтр. – Мінск, 2006. – 102 с.

21. Тусевич, Е. Мария Бирюкова : «Живём без оглядки на национальность» / Е. Тусевич // Советская Белоруссия. – 2005. – 16 авг. – С. 6.

22. Gawin, T. Polskie odrodzenie na Białorusi 1988–2005 / T. Gawin / Wysza Szkoła Administracji Publicznej im. Stanislawa Staszica. – Bialystok, 2010. – 406 s.

23. Kryszyń, T. Język polski na Białorusi / T. Kryszyn // Polska Macierz Szkolna na Białorusi [Elektroniczny zasób]. – 2009. – Tryb dostępu : http://www.pmsgrodno.org/content/view/336/1/. – Data dostępu : 26.08.2011.

24. Dubikowski, A. Nie traćcie zapał… (Rozmowa z Anżeliką Orechwo) / A. Dubikowski // Głos znad Niemna. – 2004. –8 pazd. – S. 1.

25. Kronika Ziemi Lidzkiej i Nowogródczyny // Ziemia Lidzka [Elektroniczny zasób]. – 1993. – № 12. – Tryb dostępu : http://pawet.net/zl/zl/1993_12/5.html. – Data dostępu : 24.11.2010.

26. Kronika Ziemi Lidzkiej i Nowogródczyny // Ziemia Lidzka [Elektroniczny zasób]. – 1995. – № 17. – Tryb dostępu : http://pawet.net/zl/zl/1995_17/1.html. – Data dostępu : 24.11.2010.

27. Cylindź, W. Dzieląc się opłatkiem / W. Cylindź // Głos znad Niemna. – 2004. – 9 stycz. – S. 5.

28. Ejsmont, M. Dbajmy o mowę ojczystą / M. Ejsmont // Głos znad Niemna. – 2004. – 20 sierpnia. – S. 5.

29. Zaleska, T. Wspólna praca, wspólny wysiłek (rozmowa z prezesem ZPB Tadeuszem Kruczkowskim) / T. Zaleska // Głos znad Niemna. – 2004. – 6 lutego. – S. 1, 4–5.

30. Działalność Liceum Społecznego Polskiej Macierzy Szkolnej w Grodnie // Polska Macierz Szkolna na Białorusi [Elektroniczny zasób]. – 2009. – Tryb dostępu : http://www.pmsgrodno.org/content/view/337/1/. – Data dostępu : 26.08.2011.

31. Uniwersytet Trzeciego Wieku w Grodnie przy ZS PMS // Polska Macierz Szkolna na Białorusi [Elektroniczny zasób]. – 2009. – Tryb dostępu : http://www.pmsgrodno.org/content/view/340/1/. – Data dostępu : 26.08.2011.

32. Kuprianowicz, G. Ukraińskie odrodzenie na Polesiu Zachodnim (Ziemi Brzeskiej) / G. Kuprianowicz // Над Бугом і Нарвою – Український часопис Підляшшя [Електронний ресурс]. – 1992. – № 2(3). – Режим доступу : http://nadbuhom.pl/art_2395.html. – Дата доступу : 12.10.2012.

33. Мурашкевич, В. Лист з Кобриня / В. Мурашкевич // Над Бугом і Нарвою – Український часопис Підляшшя [Електронний ресурс]. – 1995. – № 1–2. – Режим доступу : http://nadbuhom.pl/art_2178.html. – Дата доступу : 13.12.2012.

34. Нацыянальныя культурна–асветныя аб'яднанні Рэспублікі Беларусь / Каардынац. Савет па справах нац. меншасцей пры Кабінеце Міністраў Рэсп. Беларусь, Рэсп. Цэнтр нац. культур. – Мінск, 1996. – 48 с.

35. Агульнаадукацыйныя школы Рэспублікі Беларусь па стану на 6 верасня 1998 г. : стат. Давед. / М–ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Выліч.–аналіт. Цэнтр. – Мінск, 1998. – 81 с.

36. Дзідзевіч, А. Украінская нядзельная школа / А. Дзідзевіч // Голас Радзімы. – 2001. – 31 студз. – С. 3.

36. Заліпа, В. Українська освіта на Берестейщині / В. Заліпа // Над Бугом і Нарвою. – Український часопис Підляшшя [Електронний ресурс]. – 2000. – № 3. – Режим доступу : http://nadbuhom.pl/art_1334.html. – Дата доступу : 12.10.2012.

37. Бацкалевіч, У. Аляксандр Гальперын: «Адной з галоўных нашых мэтаў з'яўляецца адраджэнне яўрэяў як нацыянальнай, рэлігійнай і культурнай супольнасці» / У. Бацкалевіч // Беларусь. – 1994. – № 8. – С. 4–6.

38. Гальперын, А. Стан і тэндэнцыі развіцця яўрэйскай адукацыі (Беларусь у кантэксце дзяржаў былога СССР) / А. Гальперын // Беларусіка=Albaruthenica : Кн. 4 : Яўрэйская культура Беларусі і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі / Міжнар. Асац. Беларусістаў, Нац. навук.–асвет. Цэнтр імя Ф. Скарыны ; рэд. В. Рагойша [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – С. 157–159.

39. Вятра, Г. Саюз яўрэйскіх аб'яднанняў / Г. Вятра // Мастацтва. – 2006. – № 5. – С. 44.

40. Хвагина, Т. Пинск – Полесский Иерусалим / Т. Хвагина, Э. Злобин, И. Либерман // Мишпоха – № 20. – Режим доступа : http://www.mishpoha.org/n20/20a01.shtml. – Дата доступа : 20.01.2012.

41. О еврейских национально–культурных объединениях // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва : інфарм.–аналіт. Зб. / Нац. б–ка Беларусі. – Мінск, 1999. – Вып. 5. – С. 13–20.

42. Улитёнок, Г. Василёк и звезда Давида / Г. Улитёнок // СБ: Беларусь сегодня. – 2004. – 10 февр. – С. 11.

43. Иоффе, Э. Джойнт в Беларуси / Э. Иоффе, Б. Мельцер. – Минск : Мэджик Бук, 1999. – 94 с.

44. Іофе, Э. Яўрэі на Беларусі / Э. Іофе // Роднае слова. – 2005. – № 1. – С. 97–100.

45. Международный гуманитарный институт БГУ тянет всего лишь на факультет // БДГ : Деловая газета [Электронный ресурс]. – 2003. – 30 сент. – Режим доступа : http://bdg.by/news/news.htm?52019,1. – Дата доступа : 15.01.2012.


ПолесГУ

46. Реквием по еврейскому образованию // Авив. – 2003. – август–сентябрь. – С. 2.
47. Община литовцев в Беларуси // Амбасада Літоўскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь [Электронны рэсурс]. – 2011. – Рэжым доступа : http://by.mfa.lt/index.php?2102221582. – Дата доступа : 26.05.2011.
48. Протоколы заседаний коллегии Комитета по делам религий и национальностей при Совете Министров Республики Беларусь и документы к ним (2005 г.). // Текущий архив аппарата Уполномоченного по делам религий и национальностей. – Д. 01–03. – Т. 1.– 225 л.
49. Приказы № 451–506, 508–511, 513–550 министерства по основной деятельности и приложения к ним (17.07.–5.10.1998 г.) // Текущий архив Министерства образования Республики Беларусь. – Фонд 498. – Оп. 1. – 379 л.
50. Скробко, П.К. Этноконфессиональные отношения и вопросы развития национально–культурных объединений на Гродненщине в 90–е гг. XX в. / П.К. Скробко // Региональное сотрудничество : материалы Междунар. науч.–практ. конф., Гродно, 25–26 мая 2000 г. : в 2 ч. / Гродн. Гос. ун–т, Высш. Эконом. школа в Белостоке ; под общ. ред. Ю.Э. Белых. – Гродно, 2000. – Ч. 2. – С. 105–109.
51. Пушкін, І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска–палітычная і культурна–асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.) / І.А. Пушкін. – Магілёў : МДУ імя А. Куляшова, 2007. – 206 с.
52. Szkola w Pielasie // Magazyn Polski. – 1999. – № 2–3. – S. 60.
53. Попов, И.А. Гродненщина этноконфессиональная: взгляд на настоящее / И.А. Попов // Этносоциальные и конфессиональные процессы в трансформирующемся обществе : материалы Междунар. науч. конф., Гродно, 15–16 нояб. 2001 г. : в 2 ч. / Гродн. гос. ун–т [и др.] ; под ред. У.Д. Розенфельда. – Гродно : ГрГУ, 2001. – Ч. 1. – С. 14–22.
54. Гуринович, И. Малониай, прашоме! (Из жизни белорусских литовцев) / И. Гуринович // СБ: Беларусь сегодня [Электронный ресурс]. – 2002. – 26 нояб. – Режим доступа : http://pda.sb.by/post/23310/. – Дата доступа : 16.05.2012.
55. Гамзовіч, Р. Віргінія Тарнаўскайтэ: «У нашых дамах – літоўскі дух» / Р. Гамзовіч // Голас Радзімы. – 2005. – 24 сак. – С. 12.
56. III Усебеларускі фестываль нацыянальных культур: Гродна, 2–3 чэрвеня 2000 г. : давед. / М–ва культуры Рэсп. Беларусь, Рэсп. цэнтр нац. культур ; уклад. Т.І. Стружэцкі [і інш]. – Мінск : ТАА «Ковчег», 2000. – 56 с.
57. Лемцюгова, І.В. З вопыту работы Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур з нацыянальнымі культурна–асветнымі аб'яднаннямі Беларусі / І.В. Лемцюгова // Нацыянальныя супольнасці ў Беларусі : зб. Арт. І дак. / Рэсп. Цэнтр нац. культур [і інш.] ; пад агул. Рэд. І.В. Лемцюговай. – Мінск, 2001. – С. 19–24.
58. Степаненко, Н. Нас объединила земля Беларуси / Н. Степаненко // Витьбичы. – 2002. – 27 июня. – С. 5.
59. Білык, А. Забеспячэнне праў нацыянальных меншасцей Беларусі ў святле заканадаўчых актаў / А. Білык // Нацыянальныя меншасці Беларусі: шляхам супрацоўніцтва і згоды : матэрыялы Першай нац. навук.–практ. канф., Віцебск, 21–22 мая 1996 г. : у 3 кн. / Рэсп. Цэнтр нац. культур [і інш.] ; навук. Рэд. С.А. Яцкевіч. – Брэст–Мінск, 1996. – Кн. 1 : Канцэптуальныя пытанні развіцця нацыянальных меншасцей Беларусі. – С. 34–37.
60. Лыч, Л. Татары Беларусі на пераломах сацыяльна–палітычных эпох (XX – пачатак XXI ст.) / Л. Лыч. – Мінск : Кнігазбор, 2007. – 76 с.
61. Грамадскія арганізацыі нацыянальных супольнасцяў Рэспублікі Беларусь – удзельнікі Усебеларускага фестывалю нацыянальных культур // Мастацтва. – 2004. – № 5. – С. 5–24.
62. Протоколы заседаний коллегии Комитета по делам религий и национальностей при Совете Министров Республики Беларусь и документы к ним (2004 г.). // Текущий архив аппарата Уполномоченного по делам религий и национальностей. – Д. 01–03. – Т. 1. – 135 л.
63. Немагай, К. Станіслаў Буко : «Падтрымка міжнацыянальнай і міжканфесіянальнай згоды ў нашай краіне – гэта не высокія словы, а адно з важнейшых дасягненняў дзяржаўнай палітыкі» / К. Немагай // Голас Радзімы. – 2005. – 22 снеж. – С. 2.

Полесгу

## THE DEVELOPMENT OF EDUCATION OF THE ETHNIC COMMUNITIES IN BELARUS IN 1991–2004

*E.N. OBUKHOVA*

***Summary***

The article is devoted to the establishment of education of the ethnic communities in the Republic of Belarus in 1991 – 2004 years. The specificity of ethno–cultural education within the state educational institutions and as a private initiative has been shown, its content has also been researched, the evolution of the number of pupils involved in various forms of ethno–cultural education has been shown, the factors that contributed to the revitalization of the educational activities of ethnic communities have been identified.

**Key words:** education, ethnic communities, public schools, Belarus, ethnocultural values

© Обухова Е.Н.

*Поступила в редакцию 20 февраля 2015г.*

ПолесГУ